# Гомельскі ўніверсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 24 (811) | Аўторак, 10 верасня 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.


## ЖЫЦЦЯ СТУДЭНЦКАГА ПАЧАТАК

Мудрыя словы вялікага асветніка Францыска Скарыны аб карысці навучання, імкненні чалавека «познати мудрость и науку», якія прагучалі на пачатку адкрыцця свята «Дня ведаў-91», сталі сімвалічным эпіграфам да яго. Трэба адзначыць, што гэтае сёлетняе свята насіла своеасаблівы характар менавіта таму, што ў яго сцэнарый арганічна ўвайшлі неперааацэнныя па свайму значэнню выказванні выдатнага сына зямлі беларускай, першадрукара, чыё імя носіць наш універсітэт. Яркі каларыт урачыстасці надавалі таксама беларускія нацыянальныя касцюмы вядучых «Дня ведаў-91».

Ёсць добрая народная прымаўка: век жыві — век вучыся! Інакш лёгка адстаць ад жыцця, якое хутка ідзе наперад і ўзнікаюць усё новыя тэхналогіі, спецыяльнасці, прафесіі, нават цэлыя галіны. Якім бы ні быў атэстат, ён хутка абясцэніцца, калі не папаўняць багаж раней набытых ведаў і навыкаў. Тыя ўчарашнія школьнікі, хто гэта добра разумеў і ўсвядоміў, прайшлі нялёгкія выпрабаванні ўступных экзаменаў, каб стаць студэнтамі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, набыць прафесію, аб якой марылі.

Ад шчырага сэрца павіншаваць новае папаўненне вялікай універсітэцкай студэнцкай сям'і сабраліся 2 верасня кіраўнікі ГДУ, деканы факультэтаў, выкладчыкі. Першы са словамі віншавання да першакурснікаў звярнууся рэктар член-карэспандэнт АН БССР, прафесар Л. А. Шамяткоў. Леанід Аляксандравіч гаварыў аб тым, што сёлетні новы атрад студэнтаў будзе вучыцца ў знамянальны для нашай рэспублікі час — час адраджэння беларускай мовы, нашай дзяржаўнасці. А гэта ўскладвае на студэнцкую моладзь і асаблівую адказнасць. З гэтага часу ім, першакурснікам, садзейнічаць таксама росквіту і славе Гомельскага універсітэта, берагчы і памнажаць яго слаўныя традыцыі.

У студэнцкім жыцці ёсць свае пісаныя і непісаныя законы і правілы, аб якіх гаварыў у сваім выступленні загадчык кафедры беларускай мовы прафесар У. В. Анічэнка. Ён таксама расказаў першакурснікам, якія вядомыя беларускія празаікі і паэты вучыліся ў свой час у нашай ВНУ, выказаў спадзяванні, што праз пяць гадоў новае папаўненне прынясе шмат сапраўдных, адпавядаючых патрабаванням часу спецыялістаў.

Для добрай падрыхтоўкі і адукацыі ў нашым універсітэце першакурснікам будуць адкрыты дзверы кафедр і лабараторый, бібліятэк і чытальных залаў, шматлікіх аўдыторый. А адчыніць іх учарашнім абітурыентам дапаможа сімвалічны Ключ ведаў, які і ўручыла першакурснікам з эканамічнага і філалагічнага факультэтаў Наталлі Сергіенка і Глебу Дзеравянку ленінская стыпендыянтка студэнтка матфака Вольга Сукаліна.

Са словамі прывітання да першакурснікаў звярнулася першы намеснік старшыні Гомельскага гарсавета народных дэпутатаў С. К. Гальдадзе, якая асабліва падкрэсліла, што студэнты сёння павінны стаць носьбітамі культуры, сапраўднымі людзьмі. І нібы ў пацвярджэнне сказанага вядучы прачытаў затым словы Ф. Скарыны «Да совершен будет человек в житие своем».

Для віноўнікаў урачыстасці гучыць першы ў іх жыцці універсітэцкі званок, які даюць пяцікурснік біялагічнага факультэта Вячаслаў Берчанка і першакурсніца эканомфака Ала Гайшун. Ён паклікаў 950 юнакоў і дзяўчат у пакуль яшчэ незнаёмую для іх краіну, імя якой — студэнцтва. Будуць у гэтай краіне цяжкасці і перамогі, расчараванні і ўзлёты. Але нязменным павінна заставацца адно — вечная цяга да ведаў, без якіх і сёння, і ў агляднай будучыні нельга абысціся.

Гучыць велічная мелодыя гімна студэнтаў «Гаўдэамус», і першакурснікі запрашаюцца ў аўдыторыі факультэтаў на сваю першую лекцыю.

У добры шлях, дарагія першакурснікі! Ваша студэнцкае жыццё пачалося.

**Т. НІКАЛАЕВА.**

Фота **У. Чысціка.**





Уручэнне сімвалічнага Ключа ведаў.

## ПАПАЎНЕННЕ ЗАМЕЖНЫХ НАВУЧЭНЦАЎ

Сёмы год у нашым універсітэце на філалагічным і матэматычным факультэтах вядзецца падрыхтоўка замежных навучэнцаў. З іх ліку дыпломы флагмана вышэйшай школы Беларускага Палесся ўжо атрымаў 21 выпускнік.

Цяпер у ГДУ займаюцца юнакі і дзяўчаты з 21 краіны. Сёлета інтэрнацыянальная сям'я замежных студэнтаў папоўнілася 12-цю першакурснікамі з Лаоса, Перу і Іарданіі.

## НА ДАПАМОГУ СЕЛЬСКІМ ПРАЦАЎНІКАМ

У калгасах і саўгасах нашай вобласці сёлета вырас добры ўраджай другога беларускага хлеба — бульбы. Убраць яго без страт — важнейшая задача кожнай гаспадаркі. На дапамогу сельскім працаўнікам прыбылі і студэнты нашага універсітэта. Каля 400 юнакоў і дзяўчат другога, трэцяга і чацвёртага курсаў, якія адпачывалі летам, цяпер працуюць на бульбяных палетках Рэчыцкага і Лоеўскага раёнаў.

## ДАЙШЛА ЧАРГА І ДА ГОМЕЛЯ?

5 верасня многія гамяльчане, якія праходзілі па вуліцы Кірава каля вучэбнага корпуса № 2 нашага універсітэта, а таксама студэнты і выкладчыкі, якія ішлі на заняткі, былі моцна здзіўлены і абураны. Сваімі вачыма яны ўбачылі скінуты з пастамента і пабіты помнік У. І. Леніну. Гэтая жорсткая акцыя вандалізму, здзейсненая зламыснікамі пад покрывам цемры, не павінна застацца беспакаранай. Але здзіўляе вывад, зроблены ў Цэнтральным аддзеле ўнутраных спраў: помнік нібыта ўпаў ад ветру.

## РАШЭННЕ КАЛЕГІІ МІНІСТЭРСТВА НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ БССР

ад 2 верасня 1991 г.

У сувязі з тым, што ЛКСМБ у адпаведнасці са сваім статутам з'яўляецца грамадскай арганізацыяй, якая не ставіць перад сабой палітычных мэтаў, калегія рашае:

Пункт 3 рашэння калегіі Міністэрства ад 26 жніўня г. г. «Аб задачах органаў адукацыі і навучальных устаноў у сувязі з рашэннямі Нечарговай пятай сесіі Вярхоўнага Савета БССР 24—25 жніўня 1991 года» ў дачыненні да дзейнасці камсамольскіх арганізацый адмяніць.

За старшыню калегіі намеснік міністра **Л. К. СУХНАТ.**

## ЛЕТНІЯ ЭКСПЕДЫЦЫІ

Другі месяц лета — ліпень — для многіх студэнтаў універсітэта яшчэ не быў часам адпачынку. Іх клікала ў археалагічныя, фальклорныя экспедыцыі вучэбная практыка. У прыватнасці, першакурснікі філфака збіралі багатыя моўныя скарбы ў Акцябрскім раёне. Імі запісана вельмі шмат песень, прыпевак, замоў, абрадаў як ад мясцовых жыхароў, так і ад перасяленцаў з Чарнобыльскай зоны.

Дзякуючы такім студэнцкім экспедыцыям, фальклор выселеных вёсак застанецца жыць. Сабраны багаты моўны матэрыял будзе апрацаваны і сістэматызаваны ў створанай нядаўна ў нашым універсітэце лабараторыі «Чарнобыль і духоўная спадчына Беларусі».

